Чаму трэба ўжываць словы жаночага роду? Выкарыстоўваючы словы жаночага роду, калі кажам аб жанчынах, мы нагадваем аб гендарнай роўнасці, што так патрэбна нам сёння, мы ўзбагачаем нашу мову і падкрэсліваем яе ўніверсальнасць.

**К. Пабежка**

## РЫСЫ ЖАНРА ГІСТАРЫЧНАГА ДЭТЭКТЫВА Ў ТВОРЧАСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА
(на прыкладзе твора «Дзікае паляванне караля Стаха»)

Даследчыкі творчасці У. Караткевіча спрачаюцца наконт вызначэння жанра твора «Дзікае паляванне караля Стаха». У гэтай рабоце робіцца спроба даказаць, што жанр гэтага твора – *гістарычны дэтэктыў*, і для гэтага ёсць канкрэтныя падставы.

Пазнаёміўшыся з меркаваннямі навукоўцаў, мы прыходзім да высновы, што пазнавальнымі жанравымі адзнакамі гістарычнага дэтэктыва можна назваць наступныя: пастаноўка ў творы трох знакавых пытанняў, якія ствараюць пэўны стандарт пабудовы сюжэту (хто? як? чаму?); наяўнасць таямніцы, загадкавага здарэння, чатырохэтапнай кампазіцыйнай структуры, цесная ўзаемасувязь інтрыгі, фабулы, сюжэта; стварэнне ў чытача напружання, адпаведнага эмацыянальга стану; кола характэрных персанажаў (Вышукнік, Злачынец, Ахвяра); апісальнасць як адзін са знакавых прыёмаў гістарычнага дэтэктыва; наяўнасць гістарызму. Названыя адзнакі дакладна праяўляюцца ў аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Караткевіча.

У якасці загадкавага здарэння, абставіны якога невядомы і патрабуюць высвятлення, выступае само дзікае паляванне, а таксама асоба Маленькага чалавека і Блакітнай Жанчыны. У творы прысутнічаюць тыповыя персанажы дэтэктыва: следчы (Беларэцкі), злачынца (Дубатоўка), пацярпелы (Надзея Янкоўская), сведкі, памочнік следчага (Свеціловіч), падазроныя. Усе героі дзейнічаюць строга згодна законам дэтэктыўнага жанра.

У творы мы назіраем шмат гістарычных апісанняў, этнаграфічных падрабязнасцей: танцы («Лябедзік», «Ветрык» і інш.), стравы і напоі (гарэлка «трысдзівінірыс», ласіныя губы ў падсалоджаным воцаце). Таксама дакладна апісваецца побыт шляхты, яе норавы, традыцыйны ўклад, што і дае падставу прылічыць твор да гістарычнай літаратуры.

Мы заўважылі, што «Дзікае паляванне караля Стаха» з’яўляецца яшчэ і сімвалічнай аповесцю. Вобраз Балотных Ялін – гэта сімвал усёй Беларусі – цёмнай, знявечанай, пакрыўджанай і напалоханай «дзікім паляваннем».

Выявіўшы відавочныя адзнакі дэтэктыва ў «Дзікім паляванні караля Стаха», можна сказаць наступнае: каштоўнасць твора заключаецца ў тым, што ў адрозненне ад чыстага дэтэктыва пісьменнік імкнецца даследаваць тагачаснае грамадства не толькі праз яго супярэчнасці, але і паказаць яго нацыянальныя, культурныя гістарычныя спецыфічныя рысы.